Больш згуртоўваючы свае шэрагі вакол компартыі—ленінскі комсамол апраўдае назву чырвонаштандарнага

ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 19 (1288) НЯДЗЕЛЯ, 25-га студзеня 1931 г.

УсеЛКСМ УЗНАГАРОДЖАН ОРДЭНАМ ЧЫРВОНАГА ПРАЦОЎНАГА СЬЦЯГУ

Пастанова прэзыдыуму ЦВК Саюзу ССР ад 21 студзеня 1931 г.

За праяўленую ініцыятыву ў справе ўдарніцтва і соцыялістычнага спаборніцтва, якія забясьпечваюць пасьпяховае выкананьне пяцігадовага пляну разьвіцьця народнае гаспадаркі Саюзу ССР, Прэзыдыум ЦВК Саюзу ССР пастанаўляе:

Узнагародзіць усесаюзны ленінскі комуністычны саюз моладзі ордэнам „працоўны чырвоны сьцяг“.

Сэкратар ЦВК Саюзу ССР—А. Енукідзэ



Да ўсёй рабоча-сялянскай моладзі, да ўсіх комсамольцаў Савецкага саюзу

Адозва IX усесаюзнага зьезду УсеЛКСМ

Масква, 21 студзеня 1931 году

Дарагія таварышы!

Сем год назад у гэты дзень ад нас ушоў любімейшы і геніяльны правадыр сусьветнага пролетарыяту—Уладзімер Ільліч Ленін.

Вяліка горач гэтай цяжкай страты, нязьмерны смутак у сэрцах перадавога чалавецтва, у сэрцах рабочых і сялян. Але ўходзячы ад нас, Ленін пакінуў нам сваю найвялікшую спадчыну, Ленін пакінуў рэволюцыйна-марксысцкую тэорыю, якая дае ясанасьць пэрспэктывы, сілу ў рабоце, упэўненасьць у барацьбе і веру ў перамогу. Правадыр пакінуў нам сваё вучэньне—ленінізм.

Высока трымаючы вялікі сьцяг Леніна, сталёвая бальшавіцкая партыя вядзе непахіснае і пераможнае наступленьне ў барацьбе за пабудову соцыялізму, у барацьбе за зьнішчэньне рэштак капіталізму ў нашай краіне.

Гэтая барацьба ленінскай партыі азначылася вялізарнейшымі посьпехамі і гэтыя посьпехі сталі магчымы толькі дзякуючы таму, што партыя сьвята захоўвала ідэйную чыстату і незаплямленасьць ленінскага вучэньня, жорстка змагаючыся і пасьпяхова разьбіваючы спробы опортуністых-ныцікаў і малавераў—агентаў клясава—варожых сіл адцягнуць партыю з правільнага шляху.

I

Ленін памёр, але жыве ленінізм у вялікіх справах бальшавіцкай партыі, ленінізм перамагае! Гэтыя перамогі ленінізму, гэтыя посьпехі нашага вернага кіраўніка—комуністычнае партыі, гэтыя велічэзныя дасягненьні ў барацьбе за соцыялізм, за сусьветную пролетарскую рэволюцыю бачыць зараз кожны пролетары, кожны працоўны селянін.

Ён бачыць іх у кожным новым заводзе, новай фабрыцы, домне, шахце, электростанцыі, у кожным новым трактары.

Ён бачыць гэтыя посьпехі ў кожным новым савгасе, у кожным колгасе.

Ён бачыць гэтыя посьпехі ў тым, што пролетарыят, пад кіраўніцтвам партыі, пасьпяхова вырашае на карысьць соцыялізму ленінскае пытаньне „хто-каго“. Гэтае пытаньне ўжо канчаткова і беспаваротна вырашана ў нашу карысьць у галіне прамысловасьці. „Мы ўжо уступілі ў пэрыод соцыялізму, бо соцыялістычны сэктар трымае зараз у руках усе гаспадарчыя вагары усёй народнай гаспадаркі“. (І. Сталін). На базе суцэльнай колектывізацыі партыя праводзіць політыку ліквідацыі кулацтва як клясы.

Гэту справу ленінізму, пад кіраўніцтвам комуністычнае партыі, робяць самі масы пролетараў і перадавых працоўных сялян Савецкай краіны. Вялікім і магутным рухам узрастае соцыялістычнае спаборніцтва мас.

У гэтых бурных тэмпах соцыялістычнай будоўлі, у гэтых гарачых днях барацьбы за соцыялізм ленінскі комсамол зьяўляецца першым і лепшым дапаможнікам нашай бальшавіцкай партыі.

Уся воля, усе думкі, усе сілы трохмільённай арміі комсамольцаў і комсамолак заражаны адным непахісным імкненьнем выканаць каказ Леніна „... Быць першымі будаўнікамі комуністычнай грамады сярод мільёнаў будаўнікоў, якімі павінны быць усякі малады чалавек, усякая маладая дзяўчына“, „быць ударнай групай, якая на ўсякай рабоце аказвае сваю дапамогу, выяўляе сваю ініцыятыву і пачын“.

Сваёй нястомнай барацьбою і працай комсамол з гонарам апраўдвае ўзятае на сябе ленінскае імя. Ленінскі комсамол здолеў дабіцца, што пытаньні рэконструкцыі, пытаньні гаспадарчага будаўніцтва соцыялізму сталі стрыжнем усёй яго дзейнасьці.

Ідучы цесна згуртаванымі шэрагамі вакол бальшавіцкай партыі, „ленінскі комсамол і кіруемая ім рабочая моладзь увенчваюць справу спаборніцтва і ўдарніцтва рашаючымі посьпехамі“ (І Сталін).

Вялікія посьпехі комсамолу, але яшчэ аграмадная работа стаіць прад намі ўперадзе. Грандыёзныя задачы стаяць перад нашай краінай у разгорнутым соцыялістычным наступленьні на ўсіх фронтах. Яны ня могуць быць вырашаны стыхійна і самацёкам. Яны патрабуюць напружаньня ўсіх нашых сіл для перамогі цяжкасьцяў, якія стаяць на шляху, для прыдушэньня шалёнага супраціўленьня клясавых ворагаў—кулака, нэпмана, шкодніка і бюрократа. Вялізарнейшыя задачы, што стаяць перад намі, патрабуюць максымальнай організаванісьці і дысцыпліны, самааданасьці і гэроізму ў працы, непахісьнасьці і суровасьці ў барацьбе з опортуністамі: правымі, якія ўяўляюць галоўную небясьпеку, а таксама і з „лэвакамі“ і прымірэнцамі, якія тармозяць наша наступленьне ва ўгоду ворагам. Зараз патрабуецца далейшы рост клясавай баяздольнасьці комсамолу, яшчэ большы рост яго шэрагаў, павышэньне якасьці яго работы па організацыі актыўнасьці і працоўнага ўздыму мас рабоча—сялянскай моладзі.

II

Перад тварам новых грандыёзных задач разгорнутага соцыялістычнага наступленьня на ўсіх франтох, перад тварам найвялікшых гістарычных заданьняў трэцага году пяцігодкі. IX усесаюзны зьезд ленінскага комсамолу сёньня, у дзень сёмай гадавіны са дня сьмерці Уладзімера Ільліча Леніна, зварочваецца да ўсёй рабоча-сялянскай моладзі, да ўсіх комсамольцаў з гарачым заклікам:

Маладыя рабочыя і комсамольцы фабрык і заводаў капальняў і чыгуначных шляхоў, электростанцый і савгасаў!

Ленінскі комсамол заклікае вас да яшчэ большага напружаньня сіл у барацьбе за высокія тэмпы росту соцыялістычнай індустрыі. Ленінскі комсамол кліча вас да комуністычнай працы, кліча вас пад вялікі сьцяг ленінскага соц. спаборніцтва. Усе ва ўдарныя брыгады! Вышэй якасьць ударнай работы! Узьнімем соцыялістычны сьцяг на высшую ступень барацбы за рацыяналізацыю, за плянаваньне, за сустрэчны прамфінплян, за асвоеньне новай тэхнікі соцыялістычнай прамысловасьці! Ператварым ударны рух у магутны рэзэрвуар падрыхтоўкі новых, пролетарскіх спэцыялістых ва ўсе галіны народнай гаспадаркі і кіруючых кадраў для дзяржаўнага апарату. Ніводнага комсамольца па-за шэрагамі ўдарных брыгад—наш лёзунг. Усе маладыя рабочыя павінны стаць ударнікамі. Правядзем ленінскі заклік ва ўдарныя брыгады, правядзем у ленінскія дні праверку якасьці ўдарнасьці.

Маладыя батракі, бедпякі і серадпякі, маладыя колгасьнікі, вясковыя комсамольцы.

Ленінскі комсамол заклікае вас да ўвартай барацьбы за суцэльную колектывізацыю, за ліквідацыю кулацтва як клясы. Ленінскі комсамол кліча ўсю бядняцка-серадняцкую моладзь у колгасы. Толькі ў іх выхад з адсталасьці і ўбоства. Толькі ў іх—шлях вёскі да сьветлай соцыялістычнай грамады, да зьнішчэньня клясаў, да зьнішчэньня розьніцы паміж горадам і вёскай. Усе комсамольцы павінны стаць колгасьнікамі—вось наш лёзунг. Усе сілы вясковага комсамолу на ўцягненьне ў колгасы ня менш паловы бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у трэці год пяцігодкі—вось наша задача. Правядзем ленінскі заклік у колгасы. Няхай кожны колгасьнік будзе агітатарам за колгас. Правядзем ленінскі заклік ва ўдарныя брыгады напярэдадні другой бальшавіцкай вясны, шырэй разаўем соцыялістычнае спаборніцтва ў колгасах, умацоўваючы іх гаспадарчую моц.

Маладыя рабочыя фабрык, заводаў і саўгасаў, маладыя батракі, маладыя ўдарнікі колгасных палёў!

Ленінскі комсамол кліча вас у свае згуртаваныя шэрагі. Каб лепш тварыць вялікую справу соцыялізму, каб быць першым памочнікам партыі—ідзеце ў комсамол! Наша сіла—у організаванасьці, наша сіла—у згуртаванасьці, наша сіла—у адзінстве шэрагаў маладых ленінцаў, аддаючы кожны дзень і кожную гадзіну свайго жыцьця барацьбе за соцыялізм.

Бярэце на сябе вялікае званьне члена ленінскага комсамолу, каб з гонарам апраўдаць яго ў буднях соцыялістычнай будоўлі.

Азначым дні сёмай гадавіны сьмерці Леніна, імя якога носіць комсамол, масавым уцягненьнем у шэрагі саюзу маладых рабочых і работніц, лепшых маладых колгасьнікаў і колгасьніц.

Комсамольцы і комсамолкі Савецкага Саюзу!

У дзень сёмай гадавіны сьмерці правадыра ленінскі комсамол кліча вас уступіць у вялікія шэрагі бальшавіцкай партыі. Тысячы комсамольцаў маладых рабочых—ударнікаў і ўдарніц павінны папоўніць шэрагі ленінскай партыі ў ленінскія дні. Комсамол павінен адабраць з свайго асяродзьдзя лепшых байцоў для перадачы іх у сталёвыя шэрагі загартаванай у клясавых бойках слаўнай партыі Леніна.

„Ня ўсякаму дано быць членам такой партыі. Ня ўсякаму дано вытрымаць ліхія гадзіны і буры, зьвязаныя з членствам такой партыі. Сыны рабочае клясы, сыны патрэбы і барацьбы, сыны надзвычайных лішэньняў і гэроічных намаганьняў—вось хто перш усяго павінны быць членам такой партыі„ (Сталін)

Дамо партыі новыя тысячы маладых рабочых і работніц—членаў ленінскага комсамолу; давёўшых на справе сваю аддапасьць нашай партыі, самааддана змагаючыхся за высокія тэмпы соцыялістычнай будоўлі, умеючых стаць на чале іх і весьці за сабой масы працоўнай моладзі.

Маладыя рабочыя і колгасьнікі, комсамольцы і комсамолкі!

У дзень сёмай гадавіны сьмерці правадыра яшчэ цясьней згуртуемся вакол комуністычнай партыі, усе свае сілы аддаючы на барацьбу за яе гэнэральную лінію, за пабудову соцыялізму, за сусьветную пролетарскую рэволюцыю. Яшчэ цясьней згуртуем свае шэрагі вакол ленінскага Цэнтральнага камітэту ЎсеКП(б) і правадыра партыі, лепшага з лепшых ленінскіх вучняў—тав. Сталіна.

Пад кіраўніцтвам партыі і яе ЦК—да новых перамог, да соцыялізму! Няхай кожны дзень і кожная гадзіна нашага жыцьця і барацьбы будуць яскравым довадам, што ленінізм жыве ў сэрцах маладога пакаленьня Савецкай краіны, што ленінізм перамагае ва ўсім сьвеце!

Політычная лінія ЦК УсеЛКСМ—правільная

IX зьезд аб дзейнасьці ЦК УсеЛКСМ

IX зьезд прызнае цалком і поўнасьцю правільнай політычную лінію ЦК УсеЛКСМ і ўхваляе яго работу.

Пад кіраўніцтвам ЦК УсеКП(б), ЦК УсеЛКСМ забясьпечыў выразнае правядзеньне ленінскай лініі партыі і пасьпяхова мобілізаваў масы членаў УсеЛКСМ і кіруемую комсамолам моладзь на практычнае ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі, непрымірыма вядучы барацьбу на два фронты, супроць усіх і ўсялякіх праяўленьняў опортунізму—супроць правага ўхілу, як галоўнай небясьпекі, а таксама і супроць „левага“ опортунізму, двурушніцтва і прымірэнцтва да іх.

Зьезд са здавальненьнем констатуе, што, дзякуючы гэтай прынцыпова вытрыманай лініі ЦК УсеЛКСМ, комсамол прышоў да свайго IX зьезду монолітным і згуртаваным, як ідэёва-політычна, так і організацыйна, вакол партыі і яе ленінскага кіраўніцтва, па чале з тав. Сталіным.

Пастанова

Бюро ЦК ЛКСМБ аб рэалізацыі адозвы 9-га ўсесаюзнага зьезду ЛКСМ.

Сем год працы над выкананьнем ленінскіх запаветаў былі гадамі работы і барацьбы партыі і рабочае клясы за пабудову соцыялізму ў нашай краіне. Высока трымае сьцяг Леніна бальшавіцкая партыя, вядзе параможнае наступленьне соцыялізму па ўсім фронце, зьнішчаючы рэшткі капіталізму ў нашай краіне.

Гэтыя посьпехі сталі магчымымі дзякуючы рашучай барацьбе партыі і рабочае клясы з усялякімі опортуністычнымі адхіленьнямі ад генэральнай лініі партыі, асабліва з правым опортунізмам, як найбольш небясьпечным на даным этапе, і „левымі“ фразёрамі праводзячы ў жыцьцё ленінскае вучэньне.

Посьпехі, якія мы маем у справе соцыялістычнага будаўніцтва,—індустрыялізацыя краіны і рэконструкцыя сельскай гаспадаркі,—вырашаюць ленінскае пытаньне "хто каго" на карысьць соцыялізму, высокія тэмпы соц. будаўніцтва пры нябываллым росьце энтузіязму рабочых мас, соц. спаборніцтва, ударніцтва, прадрашаюць пытаньне аб заканчэньні пабудовы фундаманту соцыялістычнай экономікі СССР у 1931 годзе.

У гэтых гарачых днёх барацьбы за соцыялізм ленінскі комсамол зьяўляўся і зьяўляецца лепшым і першым дапаможнікам комуністычнай партыі і, пад яе кіраўніцтвам сваёй барацьбой і работай з гонарам апраўдаў узятае на сябе імя Леніна. Комсамол мае шмат посьпехаў па ўдзелу ў соц. будаўніцтве, але яшчэ больш работы стаіць уперадзе, на шляху соцыялістычнага будаўніцтва.

Адозва ІХ-га зьезду УсеЛКСМ заклікае ўсю рабоча-сялянскую моладзь, усю армію ленінскага комсамолу Савецкай краіны да новых перамог у соцыялістычным будаўніцтве. Для выкананьня гэтай адозвы, ЦК ЛКСМБ заклікае ленінскі комсамол і рабоча-сялянскую моладзь БССР мобілізавацца на штурм за высокія тэмпы індустрыялізацыі краіны, за рэконструкцыю сельскай гаспадаркі і, на базе суцэльнай колектывізацыі—ліквідацыю кулацтва як клясы, на барацьбу за генэральную лінію партыі супраць правых і „левых“ опортуністых, правa-„левацкага“ блёку і прымірэнцтва да іх, за поўнае выкананьне вытворчае програмы 3-га, рашаючага году пяцігодкі.

Наперад, да новых перамог на фронце гаспадарчага будаўніцтва

Міжнароднае і ўнутранае становішча і задачы комсамолу

Даклад тав. Кагановіча на IX зъездзе ЎсеЛКСМ*)

Нашы тэмпы будаўніцтва перавышаюць тэмпы разьвіцьця любой краіны. Але мы ведаем, як гэта падкрэсьліў тав. Сталін на 16 зъездзе, што тэмпы няроўназначны ўзроўню. Мы ведаем, што мы з вамі знаходзімся на больш нізкім узроўні, чым капіталістычныя краіны.

Мы павінны з усёй яскравасьцю зразумець, што ў нас шмат посьпехаў у нашым будаўніцтве, мы ідзём тэмпамі больш шпаркімі, чым любая краіна калі-небудзь ішла. Ні прамысловасьць Нямеччыны, ні прамысловасьць Амэрыкі, ні прамысловасьць Ангельшчыны не разьвілася такімі шпаркімі тэмпамі, якімі разьвіваецца наша індустрыя. Але па ўзроўню нашага разьвіцьця мы з вамі адсталі ў параўнаньні з многімі краінамі. І мы павінны пад лёзунгам „дагнаць і перагнаць капіталістычныя краіны“ ўпэўнена працаваць для таго, каб гэтую задачу сапраўды выканаць.

Наступныя лічбы паказваюць ступень нашага адставаньня. Здабыча нафты ў Амэрыцы ў 1929 годзе раўнялася 143 млн. тон, у СССР—19 млн. тон, а ў 1921 годзе.—26 млн. тон. Выпрацоўка энэргіі ў Амерыцы ў 1929 годзе—117 млрд. кілёват гадзін, у СССР у 1930 годзе—9 млр. кілёват гадзін, а ў 1931 годзе—12 млр. кілёват гадзін. Каменнага вугалю здабыта ў Амэрыцы 546 млн. тон, у СССР у 1930 г.—56 млн. тон, а ў 1931 годзе —83,5 млн. тон. Хоць па вугалю мы пераганяем у гэтым годзе Францыю, а па чыгуну Францыю і Ангельшчыну, але нашае адставаньне яшчэ вялікае. —Гэта абавязвае нас, каб мы і надалей упарта працавалі над тым, каб сапраўды дагнаць і перагнаць гэтыя краіны і перамагчы гэтыя цяжкасьці. Дз ля гэтага, у адзнаку капіталістычных краін, мы маем шмат пераваг. Капіталістычныя краіны, хоць і багацейшыя за нас, але іх цяжкасьці зьяўляюцца цяжкасьцямі спарахнелага, які глядзіць у магілу, старога, а нашы цяжкасьці зьяўляюцца цяжкасьцямі маладога, бацзёрага піонэра-комсамольца, які расьце і расьвітае дабіваецца таго, каб мы дагналі і абагналі капіталістычныя краіны (бурныя воплескі).

Мобілізаваць усе сілы на перамогу цяжкасьцяй

Мы павінны мобілізаваць усе свае сілы, каб перамагчы цяжкасьці. Зьвернемся да нашых цяжкасьцяй. Першая група цяжкасьцяй—гэта цяжкасьці экономічнага парадку. Мы маем абмежаваныя сродкі.

Ні адна краіна не разьвівалася і не расла без дапамогі ў той альбо іншай форме звонку, г. зн. без крэдытаў, Мы-ж знаходзімся ў капіталістычным абкружэньні, і нам прыходзіцца разьлічваць толькі на ўнутраныя рэсурсы. Мы яшчэ моцна маем патрэбу ва ўвозе з-за мяжы. Але калі нам прыходзіцца ставіць пытаньне аб увозе, дык мы павінны выбіраць, што ўвозіць. Ці ўвозіць бавоўну для тэкстылю, каб было больш мануфактуры, ці ўвозіць машыны, каб вытвараць машыны ў нас у краіне. Мы спыняемся на ўвозе большай часткаю машын, адгэтуль цяжкасьці ў разьвіцьці тэкстыльнай і гарбарнай прамысловасьці, бо ў нас яшчэ не хапае сваёй скуры, не хапае сваёй бавоўны, хоць мы сёлета ўжо зараз нарыхтавалі бавоўны больш, чым за ўвесь мінулы год.

Мы маем зараз цяжкасьці і ў галіне цяжкое індустрыі. Гэтыя цяжкасьці зьвязаны з тым, што рацыяналізатарскія мерапрыемствы недастаковы, ня маем дастаткова кваліфікаваных кадраў, што мы ня маем яшчэ столькі заводаў, якія-б вытваралі неабходную колькасьць чыгуну. Нашы вугальныя шахты яшчэ не настолькі мэханізаваны, каб павялічыць здабычу вугалю, каб накарміць удоваль нашу прамысловасьць гэтым хлебам—вугалем. Такія об'ектыўныя прычыны.

Але, апроч об'ектыўных прычын, мы тут з усёй сілай павінны біць па тых суб'ектыўных прычынах, па тых недахопах нашай працы, якія прыводзяць да таго, што плян зьніжэньня сабекошту ня выконваецца, якія прыводзяць да таго, што, перавысіўшы лічбы пяцігодкі, програму гэтага году па вугалю і мэталю ня выконваем. Рацыяналізатарскія мерапрыемствы надзвычайна слабыя, Часта гавораць: дай нам новую машыну, дай нам новы завод, а стары завод існуе і яго недастаткова скарыстоўваюць: організатарская праца вельмі часта настолькі кепская і справу організуюць так кепска, што і новыя заводы выкарыстаць як сьлед ня могуць. Гэта абавязвае нас мобілізаваць свае сілы на тое, каб програму па вугалю, мэталю і г. д. выканаць во што-б там ні стала. Толькі намаганьнямі пролетарыяту, намаганьнямі партыі і комсамолу мы гэтыя цяжкасьці здолеем перамагчы.

Мы маем цяжкасьці і ў транспорце. Транспорт адстаў. Ён гіганцкі вырас у параўнаньні з програмай, якая намячалася, але ён адстаў у параўнаньні з патрабаваньнямі, якія яму прад'яўляюць. Ён адстаў і ў сваёй організацыі і адстаў у сваім кіраўніцтве. Цэнтральнаму Камітэту прышлося нядаўна шчыльна заняцца пытаньнямі транспарту, і мы ўпэўніліся ў тым, што ў цяжкасьцях на транспарце ў большай сваёй частцы вінна тое, што мы ня ўмеем організаваць справу, У большай сваёй частцы гэтыя цяжкасьці залежаць ад таго, што людзі сьпяшаліся з усякімі перападкамі, неабдуманымі рэформамі, ня ўмелі падабраць і расставіць людзей, сваіх людзей.

Мы маем справу на транспарце і і з оваевыглядньмі формамі клясавай барацьбы. Кулацкія элемэнты, якія маюцца ў шэратах транспартнікаў, імкнуцца нам шкодзіць, зрываць нашу працу.

Вось чаму партыйныя організацыі, комсамольскія організацыі павінны ўсіліць клясавую дбайнасьць, змагацца за працоўную дысцыпліну, за захаваньне паравознага парку, змагацца за ашчадныя адносіны да паравозаў. Бяз гэтага мы, таварышы, ня зможам падняць на адпаведную вышыню транспарт. ЦК распрацаваў шэраг мер і мы думаем, што комсамол нас у гэтых мерах у справе барацьбы за палепшаньне транспорту актыўна падтрымае (воплескі).

Вашы воплескі паказваюць, што вы з гэтым згодны. Але я павінен сказаць таварышы, што калі ў другіх галінах гаспадаркі нашы ячэйкі партыі і комсамолу працуюць ня дрэнна, дык на транспорце, як работа партыйных організацый, так і работа комсамольскіх і асабліва профсаюзных ўдзе вельмі дрэнна. Барацьба за дысцыпліну, барацьба за правядзеньне ў жыцьцё дырэктыў партыі на транспорце слабая. Вось чаму мы патрабуем ад партыйных організацый, ад комсамольскіх і ад профсаюзных сапраўды бальшавіцкай працы, для таго, каб транспорт запрацаваў па-новаму і задаволіў патрэбы народнай гаспадаркі.

Штурмавыя ночы комсамолу

У справе ўдзелу ў соцыялістычным будаўніцтве комсамол мае значныя дасягненьні. Комсамол праявіў ініцыятыву ня толькі ў першы пэрыод разьвіцьця ўдарнага руху, але і ў далейшым комсамол адыграў вялікую і сур'ёзную ролю.

Вось малюнак Трактарабуду ў Харкаве.

„У Кастрычніку 1930 году на Харкаўскім трактарбудзе быў прарыў. Патрэбна было працаваць і да зімы забэтонаваць велізарнейшы мэханічна-зборачны цэх даўжынёю ў 450 мэтраў. Былі расхістаны мэханізмы і людзі. Лятуны кідалі будоўлю ў самыя адказныя дні. Партыйныя і комсамольскія камітэты абвясьцілі штурмавыя ночы. Павольна разварачвалася барацьба за бэтоніроўку 8-га вучастку. Брыгады старых будаўнікоў-бэтоншчыкаў—Марусіна, Асокіна, Місягіна —першыя павялі штурм непаладкаў. Тады-ж быў організаваны комсамольскі батальён чырвонагвардзейцаў пяцігодкі. У штурмавыя ночы, калі трэ' было забэтонаваць 107 кустоў, іх павёў комсамолец Голубеў. Яны ўвышлі на рыштаваньні, але дошкі былі расхістаны і некаторыя нават упалі ўніз, Гэта ня спыніла іх. Тыя, якія засталіся, узышлі і не пакідалі рыштаваньня гіганцкага цэху да той хвіліны, пакуль ня быў забэтонаваны апошні куст. Многія заставаліся спаць тут-жа ў рыштаваньнях, каб у любую хвіліну прыйсьці на дапамогу. Іх гналі прэч, каб ішлі адпачыць, але батальён застаўся на рыштаваньнях. Даволі сказаць, што яны пацягнулі за сабою старых, што ноччу, калі былі ўзарваны правады і пагасла сьвятло, старыя Марусін, Асокін і комсамольскі батальён засталіся да золаку, каб скончыць заліваць бэтонам цэх. Вось прамова па скончэньню бэтоніроўкі камандзіра батальёну комсамольца Голубева.

„Калі быў выяўлены прарыў, мы організавалі ўдарны комсамольскі батальён—60 чалавек маладых чорнарабочых. Прараб Кулініч 19-га чысла паказаў нам, як патрэбна бэтонаваць, і павёў на работу. У першы-ж дзень здарылася няшчасьце: 6 чалавек паляцелі ўніз. Хлопцы пацярпелі, але гэта не пахіснула батальён. Наадварот, было зроблена 48 замесаў. Напор быў вялікі, мы пачалі павялічваць вытворчасьць працы і дабіліся 120 замесаў у дзень. Дзяўчаты былі прыкладам ударнай работы. Раніцою ішоў дождж, але ніхто не хацеў пайсьці. Калі апошнія бэлькі трэ' было бэтонаваць, ноччу бэтон перавозілі бочкамі, насілі вёдрамі, толькі-б хутчэй скончыць. 5-га кастрычніка, калі па асла сьвятло, рабочыя не пайшлі. Батальён паказаў, як трэба біцца за тэмпы“.

Вынікі: на 13 дзён раней тэрміну бэтоніроўку зборачнага цэху закончылі. Цікава адзначыць, што 8-ы вучастак даў лепшых ударнікаў для ўсіх вучасткаў Харкаўскага трактарбуду. Гэтыя штурмавыя ночы глыбока запалі ў сьвядомасьць кожнага ўдзельніка, яны мацней спаялі і зрабілі адабранымі ўдарнікаў-комсамольцаў. Як працавалі тады Комсамол Пакроўскі з брыгады марусінцаў проста расказвае:

„Я буду гаварыць фактычна. Справа така: калі наша брыгада была сформавана, мы за кожным разам, калі былі непаладкі, ня кідалі работу, а клікалі адміністрацыю і імкнуліся тут-жа непаладкі адхіліць. Калі мы сёньня далі 90 заметак, а другая група дала 95 замесак, мы ў сябе ў брыгадзе гаварылі: нам трэба нацiснуць, хто гультайнічае, будзь ласкаў, падцягніся, альбо выходзь з нашай брыгады. І былі факты, калі мы з ганьбай выганялі з сваёй групы. У штурмавую ноч мы ў першую-ж зьмену далі 150 заметак.

Комсамолка Палякова яскрава надкрэсьліла значэньне штурмавых начэй:

— „Я хочу сказать, що дивчата не видстали вид того витра, який кружив на 8-й делянци; вони не видстали вид будивництва, якое деялось на 8-й делянице.

В штурмавую ничь, як один, група Поляковай не сходила четыры доби в механичного цеху.

Дивчата моей групы святкували раниш рождество пасху, та инши святки, але такого свята, як закинчине механичного цеха, воны николи не почували“.

Гэроічныя старонкі

Послухайце далей як працавалі на Магнітбудзе. Летам бягучага году на Магнітбудзе адчуваўся голад у рабочых. Адны прыяжджалі і літаральна столькі-ж ад'яжджала зноў. Партыйная організацыя парашыла пабудаваць заставу да зімы. Пастаноўлена было: „Застава павінна быць пабудавана 10-га лістапада, такая павінна быць воля ўсіх удзельнікаў будаўніцтва заставы“. (З адозвы парткому).

Амэрыканцы давалі на будаўніцтва 156 дзён, яе-ж пабудавалі ў 70 дзён. У гэтай барацьбе за заставу паказалі сябе маладыя ўдарнікі Захараў, Пласьцінкін і інш. У арцелі землякопа Салаўёва быў бунт. Яны капалі катлаваны ў рэчцы Урал. Пясок цякун сьлізгаў з лапаты, вада біла ў ногі. Рвачы і найбольш слабыя землякопы пагражалі кінуць. Салаўёў утрымаў іх тым, што сказаў, што ня выйдзе з катлавану пакуль усё ня скончыць. На вечары ўдарнікаў ён сказаў аб гэтым проста:—„памятаючы сваё абяцаньне за выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады, мы рашылі сумленна будаваць сусьветны гігант. Мне сорамна было зьмяніць словы. Я рашыў працаваць і ўгаварыў арцель“.

Арцель Захарава была горшай арцельлю на заставе. Яны першыя ўходзілі з працы. Уноч з 9-га на 10-ае верасьня брыгада маладога беспартыйнага сэзоньніка Захарава кінула працу. На чорную дошку ён папаў з арцельлю. Чорная дошка паслужыла паваротным пунктам у арцелі. Калі пашла гарачая забіўка бычкоў, Захараў не адпускаў арцелі да канца працы. Адзін з арцелі—Мухамэджанаў—кінуў працу. Тады брыгада коратка парашыла: —Выключыць, як рвача і лодара. У гэтай вялікай барацьбе за заставу, у гэтай вялікай хвалі энтузіязму, якая разьлілася на двох берагох Уралу, брыгада маладога рабочага Захарава дала 140 проц. выкананьня програмы. Калі забэтоньвалі апошні бычок у заставе, Захараў з лепшымі ўдарнікамі ўступіў у партыю.

Вялікую цікавасьць уяўляе сабою брыгада цесьляроў Пласьцінкіна. Ёю кіруе малады рабочы Пласьцікін. Большасьць у брыгадзе—старыя. Пласьцінкін расказаў аб барацьбе брыгады, якою кіраваў яго сын.

У Ленінградзе, на Бальтыцкім заводзе, будаваўся цёплаход „Абхазія“ для чорнаморскае лініі, амаль ужо гатовы, быў падпалены шкоднікамі. Па ініцыятыве комсамольскай ударнай брыгады моладзь узяла на сябе абавязак, ня гледзячы на пажар, цёплаход выпусьціць к тэрміну. Цёплаход „Абхазія“ быў выпушчаны раней тэрміну дзякуючы гэроічнай працы ўдарнікаў, працаваўшых па 12 гадзін і без выхадных дзён, і першым рэйсам з Ленінграда ў Адэсу „Абхазія“ пашла з лепшымі ўдарнікамі ўсяго Савецкага Саюзу.

На мэталюргічным заводзе імя Сталіна (Ленінград) выкананьне програмы 2-га году пяцігодкі знаходзілася пад пагрозай. Тады комсамольцы парашылі організаваць ўдарную брыгаду па выпуску 11-тысячнай паравой турбіны раней тэрміну, вызначанага заводакіраўніцтвам на 10 дзён. Працуючы ўдарнымі тэмпамі круглыя суткі, ня выходзячы з цэху, комсамольцы выпусьцілі турбіну ў вызначаны імі самімі тэрмін. Гэтым самым далі магчымасьць заводу ня толькі выканаць, але і перавыканаць прамфінплян.

Я мог-бы прывесьці шэраг фактаў з Маскоўскай вобласьці, але па скромнасьці сваёй, як мясцовы маскоўскі працаўнік я ўзяў факты з другіх абласьцей (сьмех). Я мог-бы ў прыватнасьці ўказаць на гэроізм комсамольца Падмаскоўскага басэйну. Маскоўскі камітэт партыі мобілізаваў у Падмаскоўны басэйн 1000 комсамольцаў, але знашлося добраахвотнікаў 1150 чалавек. Комсамольцы, прышоўшыя з гораду і ніколі ня бачыўшыя шахты, трымаюць там сябе гэроічна. Яны організоўваюць ударныя брыгады, цягнуць і вядуць за сабою другіх шахцёраў. Дэзэртыраў, лятуноў-комсамольцаў, у асноўнай сваёй масе, няма. Як яны былі пасланы ў падмаскоўны басэйн, так яны і засталіся там і вядуць пасьпяховую працу на вугальным фронце, на важнейшым фронце цяперашняга пэрыоду (воплескі).

На Пабедзінскай капальні комсамольцы з „1000 каў“ парашылі працаваць усе выхадныя дні покуль не прывядуць у парадак шахты. Група комсамольца Грышына, выпрацоўваючы бязтомы вурочную норму, зьверх яе аддае ўсе сілы рамонту штрэкаў, мэханізмаў, заражаючы рэшту моладзі, уцягваючы і старых гарнякоў.

На капальні імя Рыкава ў 10-ай шахце тры комсамольцы сьлесары прапанавалі дзесятніку-тэхніку, а пасьля і загадчыку шахты Конаву скласьці брыгаду для паскораньня праводкі і пуску новых малаткоў і компрэсараў. Ім у гэтым было адмоўлена. Але ўсё-ж рабочыя зламалі гэтыя супраціўленьні і на вытворчай нарадзе брыгада была складзена, у выніку з 5 гадзіны раніцы, да 11 гадзіны вечару брыгада зрабіла 11 праходак. Аўторытэт брыгады сярод рабочых і гаспадарнікаў вырас.

Я прыводжу факты станоўчыя. Але ёсьць факты і адмоўнага парадку. Возьмем к прыкладу Сталінградзкі завод, Мы пабудавалі Сталінградзкі завод, лепшыя машыны там паставілі, але машыны гэтага заводу покуль што не даюць ашчэ поўнасьцю той продукцыі, якая ім патрэбна. Чаму?

Аўладаць тэхнікай і ведамі

Зразумела, якія-небудзь правыя ўхілісты, або хто-небудзь з прадстаўнікоў права—„левага“ блёку Сырцова, Ломінадзэ схілен бачыць правал нашага будаўніцтва. На справе-ж мы маем конкрэтныя выпадкі, калі не хапала ўменьня організаваць справы. І комсамольцы гэтага заводу, складаючыя большасьць рабочых, ня здолелі знайсьці тое зьвяно, за якое патрэбна зачапіцца, ня здолелі конкрэтна падыйсьці да недахопаў, каб завод выцягнуць і вылезьці на шырокую дарогу. Цэнтральны Камітэт партыі паслаў туды групу людзей, і мы ўпэўнены, што Сталінградзкі завод у гэтым годзе сваю програму—40—45 тысяч трактароў пасьпяхова выканае. Вопыт Сталінградзкага заводу нам паказвае, што ў нашых цяжкасьцях шмат залежыць ад таго, як організаваць гэтую справу. І калі комсамол вялікае зрабіў у організацыі ўдарных брыгад, выявіў шмат гэроізму, дык па частцы глыбокіх ведаў справы, уменьня, якасьці працы,— тут комсамол яшчэ далёка ня ўсё зрабіў. Пачатак ёсьць. На шэрагу заводаў комсамольцы шмат і многае робяць у галіне рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў, але гэта покуль што пасобныя адзінкавыя групы. Вось чаму я думаю, таварышы, што наш зьезд павінен пытаньне аб удзеле комсамолу ў гаспадарчым будаўніцтве на заводзе, трэсьце, гаспадарчым аб'яднаньні, у цэху, у брыгадзе падняць на новую ступень, на вялікую вышыню. Комсамольцы павінны вывучаць конкрэтную сапраўднасьць, факты, тэхніку, праводзіць рацыяналізатарскія мерапрыемствы, умець ня толькі крытыкаваць, але дабіцца таго, каб умець праводзіць у жыцьцё свае-ж уласныя прапановы, умець браць ня толькі гэроізмам, але і ведамі справы.

Для гэтага мы павінны падняць ролю комсамолу ў справе заваяваньня тэхнікі, аўладаньня мэханізмам нашай будоўлі.

Само сабою зразумела, што комуністыя і комсамольцы не павінны пры гэтым адрывацца ад політыкі. Вядома рэч, што комсамолец павінен удзельнічаць на сходах, павінен удзельнічаць у практычнай працы. Але трэба даць магчымасьць вучыцца, вучыцца і яшчэ раз вучыцца. Толькі і тады нашы комсамольцы сапраўды будуць расьці, як сапраўдныя будаўнікі соцыялістычнага грамадзтва, як сапраўдныя будаўнікі комунізму. Вы, таварышы комсамольцы і піонэры, бязумоўна дажывяце да комунізму. Комсамольцы і піонэры павінны быць найбольш актыўнымі будаўнікамі комуністычнай грамады (бурныя воплескі).

Комсамол—верны памоцнік партыі і на вёсцы

Шмат цікавага дае комсамол і на вёсцы.

Калі абвострылася клясавая барацьба на вёсцы, шмат хто думаў, што з комсамолам на вёсцы будзе нядобра, бо комсамол у большасьці сваёй быў сялянскай організацыяй (у комсамоле было 37 проц. рабочых, а рэшта—сяляне). Некаторыя думалі, што вылучацца такія групы, якія будуць ісьці супроць нас у клясавай барацьбе супроць кулака. Асабліва наконт гэтага паклёпнічала опозыцыя.

І вось сёньня мы можам сказаць, што ў гэтай барацьбе, на тым фронце, які мы мелі на вёсцы, комсамол у асноўнай сваёй частцы аказаўся на вышыні свайго становішча, і політычныя задачы, якія партыя перад ім ставіла выканаў.

Комсамол быў сапраўдным дапаможнікам у нашым будаўніцтве.

У тых вёсках, дзе ня было парт ячэек, комсамол іграў ня толькі ролю памоцніка, выканаўцы, але ён іграў ролю застрэльшчыка ў барацьбе за колгасы, ён іграў ролю застрэльшчыка за ліквідацыю кулацтва як клясы, Бязумоўна, комсамол на вёсцы мае і шэраг недахопаў, і адным з рашаючых яго недахопаў зьяўляецца недастатковая культурнасьць, недастатковае ўменьне ўдзельнічаць у рабоце саветаў, у рабоце колгасаў. Але ўжо ў колгасах, саўгасах, комсамол іграе буйнейшую ролю.

Некалькі дзён назад я склікаў нараду 30 комсамольцаў — дэлегатаў маскоўскай абласной конфэрэнцыі, дзе былі рабочыя ад варштата і таварышы з колгасаў. І вось там выступіў комсамолец тав. Фядотаў яко му 20 год, ён зьяўляецца старшынёю сельсавету, старшынёю колгасу і сэкратаром ячэйкі комсамолу. Гэта—тып організатара соцыялістычнай вёскі.

Даволі паглядзець на аднаго гэтага Фядотава, каб убачыць, якая армія расьце на вёсцы, Гэта—той камандны склад, які забясьпечыць соцыялістычную перабудову нашай вёскі. (Бурныя воплескі).

Яшчэ раз падкрэсьліваю, што ня трэба занадта захапляцца гэтым ростам комсамолу на вёсцы.

Шэфства не абмяжоўваць музыкай

Калі я езьдзіў па Сібіру і ЦЧО, і ў аднэй з абласьцей быў са мною і таварыш Косараў, мы сабралі групы комсамольцаў. Хлопцы бязумоўна добрыя. Калі кулакі падбівалі сялян разабраць коняй з колгасу, яны тут-жа садзяцца на коняй і зьбіраюць бедната. У вогуле ваявалі хлопцы за колгасы, У гутарцы мы запыталіся ў аднаго, што такое УсеЛКСМ. Ён стаіць і думае, а потым гаворыць „Усесаюзная комуністычная партыя“—„А што такое Савецкая рэспубліка, якая яе розьніца ад дэмократычнай рэспублікі?“—„Але так,—гаворыць,—рэспубліка, адным словам, народ“. Яму цяжка гэта растлумачыць. Ён ваюе за Савецкую рэспубліку, ён яе адчувае душою, але ён яшчэ сыры, а ад яго-ж патрабуецца зараз ня толькі энтузіязм, але і актыўная будаўнічая праца. Вазьмеце колгасы к прыкладу, У нас ёсьць колгасы, дзе ўжываецца ядоцкі прынцып разьмеркаваньня. Працаваў. ці не працаваў, усё роўна яму выдаецца па колькасьці едакоў. Гэты прынцып прыводзіць да таго, што колгас слабы, як вытворчая адзінка, у колгасе няма спайкі, няма тае дысцыпліны, якая-б забясьпечыла росквіт колгасу. Я дзеля гэтага зьвяртаюся да гарадзкіх комсамольцаў: ваша шэфства над вёскаю не абмяжоўвайце музыкай, паездкаю ва ўрачыстыя дні. Няхай кожная гарадзкая ячэйка прымацуе да сябе вёску і адказвае за яе, няхай кожны вясковы комсамолец будзе ня менш разьвітым комсамолец гораду. тады мы шпаркім тэмпам перабудуем вёску.

(Працяг будзе)

---

*) Працяг. Пачатак гл у № 18.

СТАНЕМ КАМАНДЗІРАМІ ЗЯМЛІ

Партыя і ўрад прынялі конкрэтныя захады для хутчэйшых тэмпаў соцыялістычнай рэконструкцыі сельскай гаспадаркі і яе тэхнічнага пераўзброеньня

самол, як памочнік партыі, павінен змагацца за выкананьне дырэктывы партыі і ўраду аб контрактацыі пасеваў у 1931 годзе, расьпяхавое разгортваньне работы па тэхнічнаму пераўзброеньню соцыялістычнага земляробства, змагацца за лепшую падрыхтоўку да другой бальшавіцкай вясны

Кантрактацыя—магутны вагар соцыялістычнага плянаваньня сельскай гаспадаркі—руйнуючы ўдар па кулаку і яго агэнтах, опортуністых усіх масьцей

АБ КОНТРАКТАЦЫІ ЯРАВЫХ ПАСЕВАЎ 1931 г.*)

Да ўсіх партыйных, савецка-гаспадарчых, коопэрацыйна-колгасных і комсамольскіх організацый

...рвыкананьне за мінулыя два ...заданьняў пяцігадовага пляну, ...абліваасьці па галінах цяжкай ...рыі і вытворчасьці сельска-...дарчага машынабудаўніцтва, ...агчымасьць савецкай уладзе ў ...м годзе пяцігодкі яшчэ больш ...ічыць супроць папярэдніх га-...укладаньні ў сельскую гаспа-...у і ўзмацніць, такім чынам, да-...у ў бобу дзяржавы вёсцы на ...у колектывізацыі бяд-...на-серадняцкіх гаспадарак ...ыцьцяўленьня заданьня ліквід-...ыі кулацтва, як класы.

...адпаведнасьці з гэтым і ў су-...з надыходзячай кампаніяй па ...рактацыі яравых пасеваў, Са-... Народных Камісараў СССР і ...альны Камітэт УсеКП(б) лічаць ...ходным правядзеньне наступных ...ыных мерапрыемстваў:

...ы дапамогі дзяржавы сельскай гаспадарцы

Накіраваць для сельскай гас-...ркі на працягу 1931 г. 120 т. ...тараў (у пераводзе на 10 сіла-...трактар) агульным коштам у ...мільёнаў руб.

Звыш існуючых 360 машына-...тарных станцый організаваць на ...цягу 1931 году 1.040 новых ...шына-трактарных станцый з ...льным трактарным паркам у ...тысяч цягавых сіл з тым, каб ...вой 1931 г. працавала 1.105 ...шына-трактарных станцый з ...тарным паркам у 692 тысячы ...забясьпечваючых пасеў машы-...актарнымі станцыямі вясной ...1 году 18 мільёнаў гектараў ...ст 4 мільёнаў гектараў у міну-...годзе. Накіраваць на капіталь-...будаўніцтва машына-трактарных ...цый у 1931 годзе 540 міл. р.

. Падвоіць у 1931 годзе забя-...чаньне сельскай гаспадаркі сель-...гаспадарчымі машынамі супроць ...0 году (768 мільёнаў р. замест ... мільёнаў руб., у тым ліку на ... мільёнаў руб. уборачных ма-...ін). Накіраваць асноўную частку ...іх машын у колгасы і машына-...тарныя станцыі па ўстаноўле-... танных цэнах. Забясьпечыць ...сельскую гаспадарку да вясны ма-...намі на суму 370 мільёнаў руб.

. Накіраваць у сельскую гаспа-...ку 7 тысяч грузавых і легкавых ...тамабіляў, у тым ліку ня менш ...00 машына-трактарным станцыям.

. Забясьпечыць сельскую гаспа-...ку ў 1931 годзе мінэральнымі ...гнаеньнямі ў колькасьці 24 міль-...ы цэнтнэраў (145 мільёнаў пуд.) ... суму ў 105 мільёнаў руб., у ...м ліку да вясны—13 мільёнаў ...нтнэраў (76 мільёнаў пудоў).

6. Забясьпечыць сельскую гаспа-...ку сродкамі барацьбы са шкод-...мі да сэзону на суму 40 міль-...ў руб. замест 19 мільёнаў руб. ...мінулым годзе.

7. Для забясьпечаньня росту ...раджаю ў колгасах адпусьціць ...2 мільён цэнтнэраў (126 мільёнаў ...) гатунковага і палепшанага ...насеньня.

8. Савгасам „Зернотреста“ ака-...ць дапамогу колгасам шляхам вес-...ога ворыва ў колгасах ня менш ...0.000 гектараў і пасеву ня менш ...0.000 гектараў. Узмацніць усе іншыя віды дапамогі савгасаў кол-гасам (аграпапамога, выкарыстаньне сельска-гаспадарчых машын, рамонт, падрыхтоўка кадраў і інш.).

9. Адпусьціць для колгасаў і машына-трактарных станцый мільярд пацьдзесят мільёнаў рублёў па дзяржбюджэту і доўгатэрміновому крэдыту.

10. Апрача ўсіх вышэй паказаных мерапрыемстваў, абвязаць Дзяржаўны банк адпусьціць для грашовага авансаваньня пасеўшчыкаў, якія кантрактуюць продукцыю свайго паляводзтва, 355 мільёнаў рублёў на ўсе культуры (як таварныя, так і насенныя), асноўная частка якіх павінна быць адпушчана ў пэрыод апрацоўкі і перад уборкай.

Усе гэтыя ўкладаньні павінны забясьпечыць вялізарны рост тэхнічнага ўзброеньня і матар'яльнай базы колгаснага руху, які разгортваецца, і павялічыць тым самым сырцовыя і харчовыя рэсурсы краіны.

Ставячы задачай карэнным чынам палепшыць на гэтай аснове забясьпечваньне прамысловасьці сыравінай і працоўных харчаваньнем, абавязаць Наркамснаб і НКЗем СССР правесьці праз сельска-гаспадарчую коопэрацыю, Колгасцэнтр, Трактарацэнтр і Насенаводколгасцэнтр кантрактацыю яравых пасеваў на 1931 год на наступных асновах:

Па збожжавых і алейных культурах

1. Устанавіць плян кантрактацыі збожжавых і алейных культур па колгасах і бядняцка-серадняцкіх аднаасобных гаспадарках у разьмеры 58 мільёнаў гектараў, у тым ліку:

праз Хлебацэнтр—39.500 тыс. гектар.

праз Трактарацэнтр — 15.500 тыс. гектар.

праз Насенаводколгасцэнтр--3.000 тыс. гектар.

(гатунковых пасеваў для гатунковай рэпродукцыі)

Па культурах контрактацыю правесьці:

збожжавых—51.000 тыс. гектар.
сланечніку—4.430 тыс. гектар.
соі—400 тыс. гектар.
бабовых—2.000 тыс. гектар.
рысу—170 тыс. гектар.

2. Апрача адпускаемых машын і вытворчых крэдытаў адпусьціць для грашовага авансаваньня прапашных культур 40 мільёнаў руб., у тым ліку:

для сланечніку—9 мільёнаў руб,
для кукурузы—10 мільёнаў руб.
для соі—6 мільёнаў руб.
для іншых бабовых—9 мільёнаў руб.
для рысу—6 мільёнаў руб.

Выдаваць аванс перад акучваньнем і абворваньнем.

Пры выдачы сланечніку і соі забясьпечыць выдачу за наяўны разрахунак колгасам для іх членаў па 4 клгр. алею і па 3 клгр. жмыхоў за кожны цэнтнэр; аднаасобным бядняцка-серадняцкім гаспадаркам—па 3 клгр. алею і па 6 клгр. жмыхоў за кожны здадзены цэнтнэр сланечніку і соі.

Па бураках

1. Закантрактаваць усю плошчу пасеваў цукровых буракоў у колгасах і бядняцка серадняцкіх аднаасобных гаспадарках у колькасьці 1.210 тыс. гектараў.

2. Організаваць у бурачных раёнах 150 машына-трактарных станцый у тым ліку да вясны 120 машына-трактарных станцый з ахопам 375 тыс. гектараў буракоў.

3. Завесьці ў бурачныя раёны для продажу пасеўшчыкам цукровых буракоў прамысловых тавараў на суму 60 мільёнаў рублёў з тым, каб яны былі прададзены гаспадаркам, якія разводзяць буракі, у парадку нармальнага таваразвароту па ўстаноўленых танных дзяржаўных цэнах.

4. Захаваць у 1931 годзе ўстаноўленую для мінулага году выдачу за кожны здаваны цэнтнэр буракоў дармова 58 клгр. жому і 1,05 клгр. патакі і ў лік платы за буракі 60 грам цукру.

5. Адпусьціць для авансаваньня пасеўшчыкаў буракоў 41 мільён руб. з тым, каб у дапаўненьне да ўжо выдаваемых 25 проц. гэтай сумы 50 проц. яе было выдана ў часе прапалваньня і 25 проц.—у часе ўборкі.

6. Выдаць колгасам і бядняцка-серадняцкім аднаасобным гаспадаркам, якія засяваюць буракі мінэральных угнаеньняў (супэрфасфату) у беспроцантны крэдыт па 2 цэнтн. на кожны гектар са зваротам кошту ўгнаеньня ва ўстаноўленыя тэрміны і бясплатна бурачнага насеньня на 32 клгр. на кожны гектар.

Па ільну і каноплях

1. Закантрактаваць пасевы ільну і канапель у колгасах і бядняцка-серадняцкіх аднаасобных гаспадарках у наступным разьмеры:

па ільну-даўгунцу на валакно і семя—1.950 тысяч гектараў, па ільну-кудрашу на семя—400 тысяч гектараў, па каноплях на валакно і семя—700 тыс. гектараў.

2. Організаваць у ільнаводчых раёнах на працягу 1931 г. 150 машына-трактарных станцый з трактарным паркам у 75 тыс. сіл з тым, каб да вясны было організавана 77 машына-трактарных станцый з трактарным паркам у 38.500 сіл з ахопам 280 тыс. гект. пасеву ільну.

3. У дадатак да існуючых ільняных і пянькавых заводаў па першапачатковай апрацоўцы пабудаваць у 1931 годзе 489 новых заводаў, ахапіўшы імі ўсе ільна-канапляводчыя саўгасы, машына-трактарныя станцыі і пункты, у якіх намячаецца пабудова машына-трактарных станцый у 1932 годзе.

Абавязаць ВСНГ СССР выпусьціць у 1931 годзе 600 комплектаў машын для абсталяваньня гэтых заводаў і 10.000 штук ільнамялак, у тым ліку да 1-га верасьня 4.500 штук.

4. Адпусьціць да вясны 1931 г ільнаканапляводчым колгасам 1.500 тысяч цэнтнэраў мінэральнага ўгнаеньня са зваротам кошту ва ўстаноўленыя тэрміны.

5. Забясьпечыць правядзеньне пасеву льну і канапель у новых раёнах і пашырэньне пасеўных плошчаў у старых раёнах выдачай у парадку кантрактацыі насеньня ільну-даўгунцу ў колькасьці 760 тыс. цэнтн., ільну-кудрашу—120 тыс. цэнт. і канапель—310 тыс. цэнтнэраў.

6. Адпусьціць для авансаваньня пасеўшчыкаў ільну і канапель 60 мільёнаў рублёў, з якіх 40 проц. выдаецца перад пасевам і 60 проц.—перад уборкай.

7. У ільнаводчых і канапляводчых раёнах спажываючай паласы і нязбожжавых раёнах вытвараючай паласы выдаць пасеўшчыкам ільну і канапель 1,25 цэнтнэраў хлеба супроць аднаго цэнтнэра здаваемага валакна з тым, каб да веснавой сяўбы ў лік гэтай нормы было выдана па паўцэнтнэра на гектар (усяго 5,8 мільёна пудоў хлеба вясной).

8. Захаваць у 1931 годзе забясьпечаньне здатчыкаў насеньня ільну і канапель расьлінным алеем і жмыхаю па нормах 1930 году (7 клгр. алею і 10 клгр. жмыхі супроць 1 цэнтнэра ільнасемя для колгасу; 5,7 клгр. алею і 8 клгр. жмыхі для аднаасобнікаў).

9. Вызваляюцца ад звычайных норм здачы хлеба ўраджаю 1931 г. колгасы і аднаасобныя бядняцка-серадняцкія гаспадаркі ільнаканапляводчых раёнаў спажываючай і нязбожжавых раёнаў вытвараючай паласы, пры ўмове пасеву гэтымі гаспадаркамі ня менш 10-15 проц. ільну, або ня менш 5-7 проц. канапель ад агульнай пасеўнай плошчы і пры абавязковым выкананьні ім здачы ільну па кантрактацыйных дагаварох.

10. Завесьці ў ільна-канапляводчыя раёны для продажу пасеўшчыкам ільну і канапель у 1931 годзе прамтавараў на суму ня менш 100 мільёнаў руб. з тым, каб яны былі прададзены пасеўшчыкам у парадку нормальнага таваразвароту па ўстаноўленых дзяржаўных танных цэнах.

Савет Народных Камісараў Саюзу ССР і Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) заклікаюць усе партыйныя, савецка гаспадарчыя, коопэрацыйна-колгасныя і комсамольскія організацыі узяцца па бальшавіцку за справу кантрактацыі яравых пасеваў, мобілізаваць свае сілы і растлумачыць масам рабочых і сялян значэньне праводзімых савецкай уладай мер па тэхнічным пераўзброеньні і колектывізацыі сялянскіх гаспадарак, стаць на чале новага ўздыму колгаснага руху мільённых мас вёскі і забясьпечыць тым самым рашаючыя посьпехі ў справе ліквідацыі кулацтва і соцыялістычнай перабудовы вёскі.

Старшыня СНК Саюзу ССР
В. Молатаў (Скрабін)

Сэкратар Цэнтральнага Камітэту
УсеКП(б) **І. Сталін.**

21 студзеня 1931 г.

*) Друкуецца ў скарочаным выглядзе

Дапамагаем у ачыстцы насеньня

Комсамольская ячэйка і піонэрскі атрад саўгасу Дукора, разьбіўшыся на брыгады, распачалі ачыстку насеньня ў саўгасе. Ячэйка ўзяла на сябе абавязак закончыць ачыстку насеньня да 25-га студзеня, замест 1-га лютага, як гэта вызначана плянам саўгасу.

Сусед



Рыхтуюцца да 2-й бальшавіцкай сяўбы (колгас „Энгельса“, Уваравіцкага раёну)

Аб вясеньняй пасеўкампаніі і ня думаюць

Па некаторых сельсаветах Сьмілавіцкага раёну да гэтага часу не праводзіцца ніякае падрыхтоўчае працы да сустрэчы вясеньняга севу.

Так, напрыклад, у Корзунаўскім сельсавеце яшчэ нічога ў гэтым напрамку ня зроблена. Сельсавет СКТУ і комсамольскія ячэйкі бяздзейнічаюць.

Сельсавет нават не абгаварыў пытаньне аб вясеньняй пасеў-кампаніі ні на прэзыдыуме сельсавету, ні на сходах сялян.

Старшыня СКТУ Аляксееў, замест таго, каб правесьці падрыхтоўчую работу (сабраць запавычанасьць па насеньню і. г. д.) —займаецца пьянкай.

Раённы выканаўчы камітэт і РК ЛКСМБ павінны зараз-жа прыняць рашучыя захады да лежабокаў і абломавых, якія да гэтага часу ня думаюць распачаць падрыхтоўчую працу да сустрэчы другой бальшавіцкай вясны.

Вясёлы С.

Падрыхтоўка да сяўбы ўвязваецца з прылівам

Падрыхтоўка да другой бальшавіцкай вясны па Барысаўшчыне распачалася. Гэта пытаньне было абгаворана на ўсіх партыйных, комсамольскіх і грамадзкіх організацыях.

У выніку складзенага агульнага раённага пляну, які ўжо даведзен да большасьці сельсаветаў і вёсак, шэраг колгасаў ужо склаў дэталёвыя пляны вясеньняй пасеўнай кампаніі. Некаторыя колгасы і сельсаветы высунулі свае сустрэчныя пляны, якія перавышаюць раённы плян на 7—10 проц.

За час уборачнай і асеньняй пасеўкампаніі значна павялічылася колькасьць колгасаў. Калі да канца 1930 году ў раёне мелася 48 колгасаў, ды зараз мы маем 64.

Раён на 10-ае студзеня колектывізаваны на 15 проц.

Бязумоўна, гэты процант вельмі мізэрны, і таму ўся работа па падрыхтоўцы да другой бальшавіцкай вясны цесна ўвязваецца з організацыяй новага магутнага прыліву ў колгасы.

Кугель

Змагаючыся з вялікадзяржаўным шовінізмам, як галоўнай небясьпекай, не паслабляць барацьбы з контррэволюцыйным беларускім нацдэмакратызмам і шовінізмамі розных колераў

Здраднікаў партыі пролетарыяту, нацыянал-опортуністых, кулацкіх агэнтаў— Ігнатоўскага і Жылуновіча—вон з шэрагаў КП(б)Б

Пастановы прэзыдыуму і партколегіі ЦКК КП(б)Б

ад 16 студзеня 1931 г.

Па справе Ігнатоўскага Ў. М.

Ігнатоўскі, Усевалад Макараў, г. н. 1881, член КП(б)Б з ліпеня 1920 г., беларус, па соцыяльнаму паходжаньню—бацька настаўнік, а потым сьвяшчэньнік; па соцыяльнаму становішчу —інтэлігент, асьвета вышэйшая (вучыўся ў духоўнай школе, потым скончыў у давасны час унівэрсытэт)—профэсар БДУ па катэдры гісторыі Беларусі; у старой, белай і Чырвонай арміях ня служыў; у іншых партыях быў—у партыі с.-р. 19 год (з 1901 па 1918 г. у партыі расійскіх соц.-рэволюцыянэраў, а з 1918 г. па 1920 г. у партыі бел. с.-р., быў членам ЦК апошніх) і 6 мес. так. зв. беларускай комуністычнай організацыі да ліпеня 1920 г.

За час прабываньня ў КП(б)Б займаў рад адказных савецкіх пасад у БССР: у 1920 г. НКЗем БССР, потым НКАсьветы, старшыня Інбелкульту і потым Прэзыдэнт Бел. Акадэміі Навук.

Ня раз абіраўся членам ЦК КП(б)Б і быў членам Бюро ЦК КП(б)Б.

Абвінавачваецца ў тым, што

1) Паходзячы з соцыяльна-чужога асяродзішча, будучы доўгі час членам дробна-буржуазных партый, якія праводзілі актыўна контр-рэволюцыйную барацьбу супроць дыктатуры пролетарыяту, маючы за сабою такое яркае контр-рэволюцыйнае выступленьне, як удзел у рэдагаваньні і складаньні зборніку прысьвечанага юбілею дому Раманавых (1913 г.), зрабіўшы запэўненьне аб поўным разрыве з мінулым і жаданьне шчыра змагацца ў шэрагах КП(б)Б,—Ігнатоўскі, увайшоўшы у партыю, ня толькі не перамог перажыткаў антыпролетарскага сьветапогляду, ня толькі ня стаў цалкам і поўнасьцю на позыцыі марксысцка-ленінскай ідэолёгіі, а захаваў свае ранейшыя дробна-буржуазныя погляды і ідэі контр-рэволюцыйных партый.

2) У сувязі з агульнай політычнай сваёй лініяй Ігнатоўскі, стоячы на дробна-буржуазных ідэолегічных позыцыях і адбіваючы ідэі буржуазна-кулацкага нацыял-дэмократызму ў сваіх літаратурных, тэорытычных і гістарычных работах, адстойваў антыпартыйныя і антыпролетарскія палажэньні (падмену клясавай барацьбы нацыянальнай, тэорыю адраджэнства, тэорыю адсутнасьці эксплёататарскіх клясаў у Беларусі, адмаўленьне пролетарскага характару Кастрычніцкай рэволюцыі і савецкай улады, затушоўваньне ролі партыі бальшавікоў і ідэалізацыя ролі дробна-буржуазных партый і г. д.).

Больш таго, з політычнай мэтай, ва ўгоду беларускаму нацыяналізму і ў мэтах павышэньня рэволюцыйных заслуг сваіх і сваёй групы (беларускай комуністычнай організацыі), Ігнатоўскі ня брэзгаваў фальсыфікаваць гістарычныя факты, затушоўваючы сапраўдны партызанскі рух пад кіраўніцтвам КП(б)Б у пэрыод польскай окупацыі, тэндэнцыйна адлюстроўваючы ролю мнімага партызанскага руху, быццам кіраванага ім і яго групай, у той час, як у сапраўднасьці гэтага ня было.

3) У сваёй практычнай дзейнасьці на адказных пастох (НКАсьветы, старшыня Інбелкульту і потым прэзыдэнт Акадэміі Навук) Ігнатоўскі, замест партыйнага кіраўніцтва і забясьпячэньня правядзеньня лініі партыі ў рабоце гэтых органаў, служыў шыльдай для прыкрыцьця варожай справе (пролетарыяту работы і сродкам нацдэмаўскіх контр-рэволюцыйных элемэнтаў і пэратварэньня БАН у пляцдарм для контр-рэволюцыйнай дзейнасьці нацдэмаўскай арганізацыі і г. д., выконваючы ў культурна-нацыянальным будаўніцтве ролю кулацкага агэнта, аналёгічную ролю Прышчэпава ў зямельных органах.

4) Прымаючы ўдзел у так званых сямейных вечарох, якія наладжваліся контр-рэволюцыйнай групай нацыянал дэмократаў, насілі на самой справе політычны характар і служылі мэтам нацдэмаўскай контр-рэволюцыйнай работы (здабываньне усялякага роду вестак аб важнейшых пастановах савецкіх і партыйных органаў, растаноўка нацдэмаўскіх сіл у розных установах, распалажэньне да сябе кіруючых партыйных і савецкіх кадраў і т. д.), Ігнатоўскі ня толькі траціў свой політычны твар члена партыі і члена Бюро ЦК, ня толькі не даваў адпору здбываўшымся антыпартыйным і антысавецкім гутаркам, але і сам прымаў удзел у гэтым і часта разгалашаў ім сакрэтныя пастановы партыі і савецкіх органаў.

Больш таго, меў сувязь з паасобнымі зарубежнымі нацыял-дэмократамі і фашыстымі, вядучы з імі гутаркі па сутнасьці контр рэволюцыйнага характару, заахвочваючы (поощряя) і выклікаючы іх на антысавецкія выступленьні.

Такога роду дзеяньні Ігнатоўска ня толькі спрыялі ўзмацненьню нацдэмаўскай контррэволюцыйнай работы ў БССР, але служылі інтарэсам міжнароднай контр-рэволюцыі і нанесьлі вялікую шкоду партыі і дыктатуры пролетарыяту.

5) Ігнатоўскі за ўвесь час прабываньня свайго ў партыі вёў групавую барацьбу супроць правільнай нацыянальнай політыкі партыі, процістаўляючы ёй сваю нацыяналістычную лінію, групуючы вакол сябе нацыяналістычна настроеныя элемэнты ў КП(б)Б, выхадцаў з дробна-буржуазных пластоў, апіраючыся ў сваёй барацьбе з партыяй на нацдэмаўскую контр-рэволюцыйную інтэлігенцыю.

У мэтах практычнага ажыцьцяўленьня ўплыву нацыялістычных элемэнтаў у шэрагах К(б)Б, Ігнатоўскі падбіраў найбольш блізкіх свайму сьветапогляду людзей, з мэтай прасоўваньня іх у розныя савецкія і нават партыйныя органы.

Акрамя таго, Ігнатоўскі перанасіў групавую барацьбу таксама і ў шэрагі КП(б)Б, супроцьстаўляючы і там нацыянальна настроеныя элемэнты правільнай лініі партыі.

6) На працягу свайго прабываньня ў КП(б)Б Ігнатоўскі, пад націскам партыі, ня раз прызнаваў свае памылкі і антыпартыйныя і антыпролетарскія ўстаноўкі, кожны раз абяцаючы выправіць іх і не паўтараць. Аднак, як гэта з вядавочнасьцю ўстаноўлена, ў сучасны момант, ня гледзячы на свае запэўніваньні і прызнаньні перад партыяй,—працягваў фактычна нацыянал-опортуністычную дзейнасьць, уводзіў партыю ў зман і тым самым ашукваў і здраджваў партыі.

На падставе гэтага Прэзыдыум і Партколегія ЦКК КП(б)Б ПАСТАНАЎЛЯЮЦЬ:

У. М. Ігнатоўскага, як ня зжыўшага антыпролетарскага сьветапогляду і антысавецкіх партый, як сьвядома праводзіўшага на працягу ўсяго пэрыоду прабываньня ў партыі нацыянал-дэмократычную ўстаноўку ў сваёй рабоце, зьяўляючагася фактычна кулацкім агентам у партыі, як ашукваўшага партыю пакаянымі заявамі, прыкрываючы імі працяг сваёй групавой антыкомуністычнай працы, — з шэрагаў КП(б)Б і як чужога элемэнта, граўшага на руку нацдэмаўскай контр-рэволюцыі, — з шэрагаў КП(б)Б выключыць.

Старшыня ЦКК КП(б)Б Калнін.
Сакратар ПК ЦКК КП(б)Б Рыськін.

Па справе Жылуновіча З. Ф.

ЖЫЛУНОВІЧ З. Ф. (Цішка Гартны), член КП(б)Б з 1918 г., беларус 43 гады, па соц. паходжаньню—з сялян, асноўная профэсія — літаратар (раней, каля 3 год быў рабочым на дробных прадпрыемствах, потым служачы). З 1904 па 1916 год (з перапынкам) прымыкаў да меншавіцкай організацыі і з 1916 па 1918 г. прымаў актыўны ўдзел у беларускім нацыяналістычным дробна-буржуазным руху (організатар і кіраўнік Бел. Соц. Грамады ў Ленінградзе, удзельнік трох з'ездаў бел. нацыяналістычнай рады, Беларускай Соцыялістычнай Грамады і вайсковай). За час прабываньня ў партыі займаў рад адказных пастоў у Беларусі (рэдактар газ. „Сав. Бел", кіраўнік Белдзяржвыдавецтва, нам. наркомасьветы і кіраўнік галоўмастацтва і інш.).

За права-опортуністычную лінію ў нацыянальна - культурных пытаньнях на ім раз прыцягваўся да партыйнай адказнасьці (вымова ў 1928 г. і суровая вымова з папярэджаньнем у 1924 і 1929 г. г.).

Абвінавачваецца ў тым што:

1) Уступаючы ў шэрагі комуністычнае партыі бальшавікоў з дробна-буржуазных і нацыяналістычных організацый, ня толькі ня зжыў сьветапогляду і ідэолёгію гэтых антысавецкіх партый, але на першых-жа парах сваёй работы, будучы ў партыі паказаў сябе, як яркі нацыяналісты (супраціўленьне бальшавіцкім мерапрыемствам пры конструяваньні першага савецкага ўраду Беларусі, патрабаваньне захаваньня ў КП(б)Б самастойнай беларускай сэкцыі і інш.), тым самым актыўна процістаўляў сябе і дэзорганізатарскі дзейнічаў супроць бальшавіцкага кіраўніцтва.

2) Адхілены ад актыўнай ролі ў першым савецкім урадзе БССР, як падарваўшы давер'е партыі сваімі нацыяналістычнымі дзеяньнямі, Жылуновіч і потым не ацьвярозіўся ад нацыяналістычнага чаду і ва ўсёй сваёй далейшай дзейнасьці на літаратурным фронце і ў практычнай савецкай рабоце ня толькі сам праводзіў нацыянал-опортуністычную і нацыянал-дэмократычную лінію, але служыў шыльдай і зьяўляўся рупарам контр-рэволюцыйнай дзейнасьці нацыянал-дэмократаў, акружыў сябе ў сваёй рабоце, галоўным чынам, нацдэмаўскімі і нац.-опортуністычнымі элемэнтамі. Будучы рэдактарам газэты „Савецкая Беларусь", а потым кіраўніком Белдзяржвыдавецтва, ператварыў іх у органы для выступленьняў, абслугоўваньня і пропаганды контр-рэволюцыйных, нацдэмаўскіх ідэй. У гэтых-жа мэтах было выкарыстана літаратурнае аб'яднаньне і часопіс „Полымя". Акрамя таго, ведаючы аб фальсыфікацыі гістарычных фактаў Ігнатоўскім і інш. (гісторыя рэволюцыйнага руху Беларусі, мнімая партызанская дзейнасьць так званай БКС, якою быццам-бы кіраваў Ігнатоўскі, скажэньня гісторыі КП(б)Б і інш.). Жылуновіч ня толькі не выкрываў іх, а і сам ва ўгоду беларускаму нацыяналізму фальсыфікаваў і скажаў гістарычныя факты (мнімая рэволюцыйная дзейнасьць Бел. Соц. Грамады, Рады і г. д.).

3) Будучы адарваным ад пролетарскіх мас, страціўшы пролетарскае чуцьцё ў сваёй рабоце, орыентуючыся на нацдэмаўскую інтэлігенцыю і не зразумеўшы сацыялістычнага пыцьця ў вырашэньні нацыянальнага пытаньня і культурна-нацыянальнага будаўніцтва, Жылуновіч мецную сувязь з супрацоўніцтвам і апіраўся на яе ў мэтах супрацьстаўленьня і барацьбы за зьвярненьне партыйнай лініі ў нацпалітыцы. Сумесна з нацдэмамі, стоячы на пазыцыях адраджэнства, орыентуючыся ўвесь час на буржуазны Захад у процілегу Саюзу ССР, ухваляючы буржуазную культуру, скочваўся да простай сувязі з нацыянал-фашыстамі (Заявіт). Луцкевіч), сьвядомы контр-рэволюцыйнай рабоце нацдэмаў і іх спробе перабудаваць БССР у буржуазна-кулацкую дзяржаву.

4) Ня гледзячы на неаднаразовыя папярэджаньні і прыцягненьні да партыйнай адказнасьці, аж да выключэньня з партыі (за сумеснае выступленьне з нацдэмаўскімі элемэнтамі ў часе так званай „акадэмічнай конфэрэнцыі", за тэатральную дыскусію і г. д.), Жылуновіч не толькі не зрабіў спробы выправіць сваю антыкомуністычную лінію, але па сутнасьці працягваў праводзіць варожую партыі працу, двурушнічаў і ашукваў партыю, утойваючы ад яе (ня гледзячы на пэрыод чысткі) рад фактаў, якія датычаць яго сувязі і інш. нац.-опортуністычных знаёмых (выданьне так званых „сямейных вечароў", а па сутнасьці палітычных вечароў, служыўшых формай групоўкі нацдэмаўскіх элемэнтаў і г. д.),—ня толькі утойваў ад партыі антыпартыйныя, нацыяналістычныя і шовіністычныя выступленьні і інш., і ўдзельнічаў у іх і тым самым нанёс вялікую шкоду партыі.

Выходзячы з вышэй выкладзенага, Прэзыдыум і Партколегія ЦКК КП(б)Б пастанаўляюць:

ЖЫЛУНОВІЧА З. Ф. за сьвядомае праводзяньне ім нацыянал-опортуністычнай і нацыянал-дэмократычнай лініі, за ўдзел у антыпартыйных групоўках у КП(б)Б, за сувязь з чужымі і варожымі справе пролетарыяту нацдэмаўскімі і фашыстоўскімі элемэнтамі і як групоўкі, якога скарыстоўвалі ў сваіх мэтах нацдэмаўскія контр-рэволюцыя ў барацьбе з дыктатурай пролетарыяту,— з шэрагаў КП(б)Б выключыць.

Старшыня ЦКК КП(б)Б Калнін.
Сакратар ПК ЦКК КП(б)Б Рыськін

1-я Ўсебеларуская конфэрэнцыя ФЗВ мэталісты…

ФАБЗАВУЧНІКІ ПАТРАБУЮЦЬ…

замацаваньня заваяваных позыцый ФЗВ, стварэньня найлепшых умоў для працы школ ФЗ…

Другі дзень працы конфэрэнцыі пачаўся садакладам тав. Сулькіна, які, таксама як Кліштафук, адзначыў, што гаспадарчыя організацыі і белкамітэт няўважліва адносіліся да ФЗВ. Белкамітэт дагэтуль ня ведае, якую колькасьць кваліфікаваных рабочых ён павінен падрыхтаваць праз ФЗВ. Пачынаючы з ВСНГБ і канчаючы групоргам, усе павінны адказваць за працу ФЗВ.

У спрэчках першымі выступалі дэлегаты з Віцебску. Дэлегаты адзначылі, што Белметальаб'яднаньне дрэна правяло падрыхтоўку да конфэрэнцыі, што некатрыя гаспадарчыя організацыі па-галавацяпску …ністрацыі, з-за холаду 10 дзён працавалі майстэрні ФЗВ.

Дэлегаты заводу „Рухавік Р…люцыі" зьвярнулі ўвагу на гал…цяпскія адносіны да ўцягне… дзяўчат у вытворчасьць, былі …падкі, калі маладых дзяўчат п…лалі на цяжкую працу, з якою бязумоўна не маглі справіцца.

Тав. Шапіра (Магілеў)—Бе…тальаб'яднаньне не кіравала …правярала працу школ ФЗВ. За… кіраўніцтва вельмі часта гля… на ФЗВ, як на нейкі цяжар … заводу.

Выступіўшыя далей тавар… адзначалі няправільную пастан…



Гомельскія дэлегаты конфэрэнцыі т. т.: Марынчанка, Ліўшыц і Грачоў.

адносіліся да кіраўніцтва ФЗВ і стварэньня найлепшых умоў для іх працы.

Дэлегаты з Гомелю ў сваіх выступленьнях адзначалі дрэнную падрыхтоўку да конфэрэнцыі ФЗВ. Тав. Марынчанка,—дэлегат ФЗВ з заводу Ланцуцкага, — гаварыць аб галавацяпскіх адносінах да падрыхтоўкі кадраў дырэктара заводу тав. Хімакова, яго грубыя адносіны і г. д. Калі ФЗВ зьбірае непатрэбны заводу лом, заводакіраўніцтва ўсялякімі сродкамі імкнецца гэтаму перашкодзіць.

Тав. Пайшулер у сваім выступленьні адзначыў, што па віне адмі… пытаньня і дакладчыкам з Б…тальаб'яднаньня. Спасылаючы… розныя об'ектыўныя прычыны, імкнуўся працягнуць опортуніс…ную лінію ў пытаньне падрых… кадраў. Нядбайныя адносіны… ФЗВ часта мяжуюцца са шко…твам. Вучні патрабуюць леп… умоў для сваей працы і до… падрыхтоўку да лютаўскага н… ў ФЗВ.

Учора конфэрэнцыя засл… даклад ЦК ЛКСМБ аб грамадзк… літычным выхаваньні ў школах… пасьля чаго разгарнуліся вя… спрэчкі па дакладу.

Пост „Чырвонай Зьм…

АДКАЗНЫ РЭДАКТАР—РЭДКОЛЕ…

Згублены.

— Комсамольскі біл. за № 93834, на імя. Шаўкова М., выд. Капыльскім РК КСМ.

— Профсаюзны біл. за № 7212. на імя Шаўкова М., выд. саюзам Дрэваапрацов.

— Комсам. біл. за № 13550… імя Шостак Р.Н., выд. Мен. ЛКСМБ.

— Вучнёўскае пасьведчаньн… школы на імя Рабкіна А.

— Студэнцкае пасьведчаньне на імя Лабанавай Х. Б. выд Архіт. політэхнікумам,

Друкарня імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599